УДК 94(476)“1941/1944“(045)

***Новікаў Сяргей***
*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

# НАЦЫСЦКІ ЭКАНАМІЧНЫ ГЕНАЦЫД Ў БЕЛАРУСІ Ў АДЛЮСТРАВАННІ АЙЧЫННЫХ І ЗАМЕЖНЫХ КРЫНІЦ[3]

У артыкуле аналізуецца стан распрацаванай крыніцазнаўчай базы і вынікаў праведзеных навуковых як беларускіх, так і нямецкіх даследаванняў па гісторыі германскага эканамічнага генацыду грамадзянскага насельніцтва Беларусі ў 1941–1944 г. Аўтар прыходзіць да высновы, што шматлікія катэгорыі людзей на акупаванай беларускай тэрыторыі з аб’екта нацысцкай эканамічнай палітыкі пераўтварыліся ў галоўны суб’ект рабскай працы на месцах. Найбольш маштабным з’яўляецца прыцягненне жыхароў беларускай вёскі да выканання абавязковых харчовых паставак для германскага вермахту.

---

[3] Даследаванне выканана пры фінансавай падтрымцы БРФФД і РФФД у рамках праекта Г20Р-011 «Современное зарубежное историческое белорусоведение: эволюция методологических подходов и оценок»

***Ключавыя словы: грамадзянскае насельніцтва, дакументальныя крыніцы, гістарыяграфічныя факты, нацысцкая эканамічная палітыка, эканамічны генацыд, рабская праца.***

Даследаванне фактычных наступстваў правядзення нацысцкай палітыкі эканамічнага генацыду ў адносінах грамадзянскага насельніцтва Беларусі стала ў парадак дня беларускіх навукоўцаў толькі ў канцы мінулага тысячагоддзя. Дзякуючы калектыўнай працы, падрыхтаванай гісторыкамі і архівістамі, адзначанай Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь 2002 года [1; 2; 3; 4; 5], як бясспрэчны гістарычных факт у грамадскім наратыве апынуліся амаль чатырыста тысяч беларускіх грамадзян, вывезеных у Германскі рэйх і выкарыстаных там на самых розных прымусовых працах цягам 1942–1945 гг. «Беларускія остарбайтары», як іх сёння называюць у навуковай літаратуры, выштурхнутыя на многа гадоў з масавай свядомасці ў грамадстве, але захаваныя ў памяці людзей пасляваеннага часу, толькі праз дзесяцігоддзі былі вернуты ў цэнтр гістарычнага і навуковага наратываў, дзякуючы чаму ўдалося канчаткова вывесці іх з гэтага доўгага «ценю» грамадскага замоўчвання, а таксама ўключыць у інстытуалізаваную сістэму гістарычнай адукацыі, вярнуць у гістарычную памяць беларускага народа суверэннай рэспублікі.

Аднак на той час гэтага нельга было сказаць у адносінах тых, хто тры гады знаходзіўся ва ўмовах германскай акупацыі на захопленай тэрыторыі Беларусі. Прайшло больш за паўвека часу пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, але тэма прымусовай працы на месцах заставалася фактычна не асэнсаванай ні навукай, ні грамадствам, ні дзяржавай. Хоць у колькасным вымярэнні гэтыя людзі пакінулі не менш глыбокі след ў гісторыі ваеннай паўсядзённасці, але былі фактычна «выштурхнуты» з беларускай савецкай гістарыяграфіі. Пры гэтым шматлікія факты выкарыстання мясцовага насельніцтва ў якасці працоўнай сілы на розных аб’ектах ваеннай, прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, лясной гаспадаркі і іншых сфер працоўнай эксплуатацыі дакументальна засведчана ў шматлікіх гістарычных матэрыялах пачынаючы з летніх месяцаў 1941 г. Пра гэтых людзях афіцыйная беларуская гістарычная навука згадвала толькі мімаходзь, пакідаючы на другарадным плане, г. зн. без усебаковага вывучэння, аналізу і ацэнкі [6]. У той час як у колькасным вымярэнні менавіта гэта катэгорыя вязняў нацысцкага эканамічнага генацыду значна перавышала лічбы тых, хто быў вывезены на прымусовыя работы за межы акупаванай Беларусі.

Таму ў пачатку XXI стагоддзя для ваенных даследчыкаў не было дзіўным тое, што да апошняга часу ў беларускай гістарыяграфіі адсутнічала спецыяльнае даследаванне аб маштабах, характары і асаблівасцях працы мясцовага насельніцтва, якое ваеннымі і грамадзянскімі органамі германскай акупацыйнай улады не толькі шырока прыцягвалася, але і татальна эксплуатавалася ў рэжыме ваеннай паўсядзённасці. Заўважым, што гэта задача аказалася фактычна не вырашанай у ходзе падрыхтоўкі ў пачатку нулявых гадоў спецыяльнага дысертацыйнага даследавання, прысвечанага тэме «Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941–1944 гг.)» [7]. Галоўнае пытанне – аб колькасці беларускіх грамадзян, занятых у рамках выканання «абавязковай працоўнай павіннасці» непасрэдна на акупаванай тэрыторыі Беларусі – ў дысертацыі засталося без адказу [8].

Актуальнасць распрацоўкі гэтай тэматыкі на цяперашні час разам з акадэмічным узмацняе не толькі інфармацыйна-пазнавальны фактар, але і патрабаванні сучаснай культуры памяці. У гэтай сувязі аўтар артыкула бачыць перад сабой задачу па аднаўленні цэласнай карціны гісторыі германскай эканамічнай палітыкі ў адносінах да грамадзянскага насельніцтва Беларусі, якое ў гады германскай акупацыі стала не толькі аб’ектам, колькі адной з важных катэгорый ахвяр нацысцкай палітыкі эканамічнага генацыду на тэрыторыі Беларусі. Як вядома, яна знаходзілася ў падпарадкаванні розных ваенных, ваенна-паліцэйскіх і грамадзянскіх службаў пачынаючы з армейскага камандавання на паўночным усходзе Беларусі і завяршаючы органамі ўлады германскага рэйха ў складзе тэрыторыі Усходняй Прусіі на захадзе. Адзначым, што больш паловы беларускай тэрыторыі на захадзе і поўдні  знаходзілася ў вядзенні грамадзянскай адміністрацыі, усталяванай у форме гебітс- і крайскамісарыятаў, якая забяспечвала іх функцыянаванне на беларускіх землях, уключаных ва Усходнюю Прусію, у Рэйхскамісарыяты «Остланд» і «Украіна». Астатняя тэрыторыя знаходзілася ў вобласці дзейнасці камандавання тылам групы армій «Цэнтр». Дакументы толькі вышэйзгаданых органаў і іх асноўных гаспадарчых службаў, існуючых у кожнай з названых акупацыйных інстанцый, складаюць сёння даволі значную базу ключавых крыніц.

Крыніцазнаўчы і гістарыяграфічны аналіз праблемы патрабуе яе разгляду ў кантэксце выяўленага на цяперашні час масіву архіўных дакументаў і матэрыялаў, а таксама ўведзеных у навуковы зварот у апошні час беларускімі і нямецкімі даследчыкамі ключавых гістарыяграфічных фактаў. Адзінай працай, якая ўтрымлівае вялікую колькасць арыгінальных дакументаў, у тым ліку нямецкага паходжання, і

прысвечанай прымусовай працы на акупаванай беларускай тэрыторыі, з'яўляецца на цяперашні час навуковае даследаванне «Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг.» (Минск, 2010) [9]. Калектыўная манаграфія, падрыхтаваная прафесійнымі ваеннымі гісторыкамі ў канцы нулявых гадоў, вырашае шматлікія даследчыя, адукацыйныя і інфармацыйна-культурныя задачы.

У гэтым плане неабходна адзначыць, што навуковую класіфікацыю працоўнай сілы, прыцягнутай да выканання работ на акупаванай тэрыторыі Беларусі, крыху раней упершыню паспрабаваў вызначыць магістрант гісенскага ўніверсітэта А.Я. Далгоўскі. З улікам таго, што мясцовая працоўная сіла прыцягвалася featureнымі германскімі акупацыйнымі службамі да выканання работ як часовага, так і пастаяннага характару, даследчык падзяляе яе на наступныя катэгорыі, замацаваныя рознымі дакументальнымі крыніцамі: 1) мясцовая працоўная сіла, якая ў прымусовай форме прыцягвалася ваенным камандаваннем ці грамадзянскімі ўстановамі на кароткі тэрмін для розных работ накшталт рыцця акопаў, чысткі дарог, уборкі снегу і расчысткі завалаў; 2) мясцовая працоўная сіла, якая размяшчалася ў стацыянарных лагерах ці прыцягвалася для работ ў рамках дзейнасці аддзелаў па арганізацыі працоўнай сілы пры нямецкіх дывізіях, ці якая выкарыстоўвалася для выканання пастаяннай работы на вытворчасці, нарыхтоўцы торфу, валцы лесу ці на будаўнічых работах у рамках дзейнасці нямецкай будаўнічай арганізацыі «Тодта»; 3) працоўная сіла са складу яўрэяў, ваеннапалонных ці цыган (роман), якая прыцягвалася да працы ваеннымі ці грамадзянскімі органамі нямецкай улады для выканання асобных работ с мэтай выкарыстання знясільваючай эксплуатацыі для гібелі гэтай катэгорыі людзей; 4) мясцовая працоўнай сіла, якая неаднаразова прыцягвалася нямецкімі службамі на кароткатэрміновыя работы на акупаванай тэрыторыі Беларусі [10, S. 41–42]. Заўважым, што гэты падыход у адносінах да вызначэння «катэгорый прымусовай працы» істотна адрозніваецца ад нямецкага, замацаванага ў найноўшай германскай гістарыяграфіі [11].

У той жа час аўтары новага беларускага калектыўнага навуковага даследавання імкнуліся на аснове арыгінальных крыніц паказаць розныя бакі маладаследаванай тэмы, выкарыстоўваючы для гэтага цэлы комплекс архіўных дакументаў і матэрыялаў. Значная ўвага надавалася розным відам прымусовай працы, якую выконвалі ў штодзённай практыцы тыя, хто выконваў абавязковую працоўную павіннасць, якая з'ўлялася часткай праграмы прымусовай прыцягнення грамадзянскага насельніцтва да працы, характарызуючы яго

матэрыяльны стан і раскрываючы механізмы мабілізацыі ў германскі рэйх. Дзякуючы ўвядзенню новых дакументаў, аўтарам удалося рэканструяваць у агульных рысах гістарычную карціну функцыянавання на месцах акупацыйнага механізму прымусовага працавыкарыстання грамадзянскага насельніцтва [9, с. 22–89; 12, S. 129–163; 13, с. 83–135; 14, с. 360–428]. Розныя групы дакументальных крыніц дазволілі вызначыць адносіны людзей да мерапрыемстваў германскіх акупантаў, яго рэакцыю на агітацыйныя і адміністратыўныя мерапрыемствы, якія праводзіліся ў працоўнай сферы рознымі ваеннымі, ваенна-паліцэйскімі і грамадзянскай уладамі.

Выкарыстанне працоўных рэсурсаў Беларусі германскія ўлады распачалі з першых дзён яе акупацыі. Канкрэтныя задачы па прыцягненні мясцовай працоўнай сілы вынікалі з «Дырэктыў па вядзенні гаспадаркі на новазанятых усходніх тэрыторыях», якія былі прыняты 16 чэрвеня 1941 г. [12, S. 133]. Адпаведна іх мясцовае насельніцтва павінна было ў абавязковых парадку прыцягвацца да выканання аднаўленчых работ і для забеспячэння бесперапыннага прасоўвання вайсковых часцей вермахта на ўсход. Камандаванне часцей і палявых камендатур павінна было зыходзіць з таго, што выкарыстанне мірнага насельніцтва не павінна адмоўна ўплываць на правядзенне работ па ўборцы ўраджаю, а таксама на вытворчасць важнай у ваенным плане прадукцыі [15, S. 279–281].

Распараджэннем імперскага міністра па справах акупаваных усходніх тэрыторый Розенберга ад 5 жніўня 1941 г. уводзілася ўсеагульная працоўная павіннасць для ўсяго насельніцтва ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў, для яўрэяў – з 14 да 60 гадоў [16, S. 452]. Улікам працаздольнага насельніцтва займаліся спецыяльна створаныя для гэтага аддзелы працы 20 акруговых камісарыятаў і біржы працы. Да лютага 1942 г. на тэрыторыі генеральнай акругі «Беларусь» былі ўтвораны 9 бірж працы – у Мінску, Баранавічах, Лідзе, Навагрудку, Слоніме, Вілейцы, Слуцку, Глыбокім і Ганцавічах. Рэгістрацыя на біржах працы насіла абавязковы характар. Прымушанае голадам (працуючыя атрымлівалі прадуктовыя картачкі) і пагрозамі насельніцтва працавала на прадпрыемствах, якія мелі, галоўным чынам, ваеннай значэнне, будаўніцтве, рамонце і расчыстцы шашэйных і чыгуначных дарог, аэрадромаў, здабычы торфу, нарыхтоўцы і вывазе лесу, пры правядзенні розных сельскагаспадарчых работ і г. д. [2, с. 8–9].

Крах «бліцкрыгу» у вайне супраць СССР стаў рубяжом, калі берлінскія стратэгі былі вымушаны уносіць істотныя карэктывы ў акупацыйную палітыку на ўсходзе ўвогуле, і у тым ліку ў практыку вядзення ваеннай эканомікі на месцах. З лістапада 1941 г. у аснову

дзейнасці германскіх гаспадарчых органаў, арганізацый і службаў ляглі «агульныя прынцыпы эканамічнай палітыкі на новазанятых усходніх тэрыторыях» [17, л. 42–51]. У адпаведнасці з унесенымі зменамі вышэйшым законам далейшага вядзення вайны нацысцкае кіраўніцтва аб'яўляла «патрэбнасці ваеннай эканомікі» [18, Bl. 74]. У лік важных ваенна-эканамічных задач разам з харчовым забеспячэннем вермахта з рэсурсаў захопленых тэрыторый таксама называлася аднаўленне прамысловай вытворчасці, але перш за ўсё – выкарыстанне мясцовых *людскіх рэсурсаў* з захопленай тэрыторыі СССР. Гэта датычылася як яўрэяў, так і ваеннапалонных, масавае знішчэнне якіх адбывалася ў тым ліку шляхам іх працоўнай эксплуатацыі.

Ліквідацыя яўрэяў у рамках «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання» знайшло выражэнне таксама ў рабскай эксплуатацыі працаздольных прадстаўнікоў гэтай групы насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі. 15 ліпеня 1941 г. эканамічны штаб Ост выдае распараджэнне, паводле якога яўрэі магла прыцягвацца да выканання работ у тым выпадку, калі яны займаліся вытворчасцю важнай «ваеннай прадукцыі», а таксама ў выпадку недахопу на месцах неяўрэйскай працоўнай сілы [16, S. 57]. У сярэдзіне жніўня 1941 г. Рейхскамісар «Остланда» Лозэ падрыхтаваў дырэктыву, якой прадугледжвалася выкарыстанне працаздольных яўрэяў у якасці працоўнай сілы, стварэнне яўрэйскіх працоўных каманд і выкарыстанне іх на работах за межамі гета [19, S. 188]. Яўрэі ва ўзросце ад 14 да 60 гадоў актыўна выкарыстоўваліся на розных прымусовых работах. Аб гэтым пераканаўча сведчаць факты занятасці яўрэяў Мінскага гета вясной 1943 г. Ліквідацыя іх на акупаванай тэрыторыі да таго часу практычна была завершана, аднак сярод тых, хто быў заняты на працоўных аб'ектах акупаванага Мінска, практычны кожны пяты ці 18,3 % складала менавіта яўрэйская працоўная сіла [14, с. 406].

Папаўнялі мясцовыя працоўныя рэсурсы і савецкія ваеннапалонныя, якія апынуліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі, і шырока выкарыстоўваліся на розных работах. Калі пытанне аб выкарыстанні працы савецкіх ваеннапалонных на тэрыторыі самога рэйха на пачатковым этапе правядзення аперацыі «Барбароса» заставалася ў полі старых дэбатаў сярод вышэйшага нацысцкага кіраўніцтва, тады як у ходзе прасоўвання часцей вермахта па савецкай тэрыторыі ваеннапалонныя выкарыстоўваліся практычна з першых дзён вайны на розных работах, асабліва пры расчыстцы руін і завалаў, ачыстцы і будаўніцтве дарог і мастоў, выкананні пагрузачна-разгрузачных работ, у якасці рабочых у ваенна-будаўнічай арганізацыі «Тодта». Загадам генерал-кватэрмайстра вобласці тылу сухаземных войскаў Гофмана ад 2

жніўня 1941 г. прадпісвалася «прыцягваць да работ усіх без выключэння савецкіх ваеннапалонных» [16, S. 792]. З устанаўленнем зоны армейскага тылу ствараюцца працоўныя зборныя лагеры, якія знаходзіліся ў Бабруйску, Барысаве, Віцебску, Гомелі, Жлобіне, Магілёве, Оршы [2, с. 9]. З ваеннапалонных фарміраваліся рабочыя каманды, працягласць выкарыстання якіх залежала ад аб'ёмаў выканання работ: адны з іх былі стацыянарнымі, з доўгім тэрмінам знаходжання на тэрыторыі самога аб'екта ці побач з ім, але не на тэрыторыі размяшчэння дулага (Dulag) ці шталага (Stalag); другія каманды выкарыстоўваліся толькі на дзённых работах. Акрамя таго, паўздоўж лініі абароны нямецкіх вайсковых часцей фарміраваліся рабочыя калоны, рабочыя батальёны, рабочыя роты і працоўныя каманды, створаныя з грамадзянскага насельніцтва для выканання гаспадарчых работ і будаўніцтва абарончых збудаванняў [20, с. 7]. Неабходна таксама адзначыць, што для таго, каб замацаваць працоўную сілу і зменшыць яе цякучасць з 1942 г. гебітскамісары пачалі ствараць пастаянныя «лагеры працоўнай сілы», сярод якіх вылучаліся «выхаваўчыя лагеры». Напрыклад, такія лагеры былі створаны пры кожным акруговым камісары (Брэст, Пінск, Кобрын, Столін) у генеральнай акрузе «Жытомір і Падолія»: у Кобрыне праз яго праходзіла ад 200 да 300 вязняў, тады як за час існавання такога лагера ў Брэсце праз яго прайшло 1800 чалавек, з якіх стала знаходзілася толькі ад 10 да 15 % [16, S. 493–494].

Такім чынам, з пачаткам германскай акупацыі савецкія ваеннапалонныя і мясцовае грамадзянскае насельніцтва, у тым ліку яўрэі, якія апынуліся на захопленай тэрыторыі Беларусі, у рознай ступені прыцягваліся да выканання тых ці іншых работ. Ужо з канца 1941 г. ўсё працаздольнае насельніцтва павінна было ў першую галаву забяспечваць патрэбы ваеннай эканомікі рэйху, для чаго ўся мясцовая сіла падзялялася на 5 катэгорый: 1) працоўная сіла, якая павінна была выкарыстоўвацца для вырашэння неадкладных задач нямецкіх ваенных часцей, акупацыйных ваенных і грамадзянскіх органаў улады; 2) працоўная сіла, занятая вытворчасцю ўзбраенняў і ваеннага амуніцыі; 3) працоўная сіла, якая выкарыстоўвалася для вырашэння задач харчовага забеспячэння і правядзення сельскагаспадарчых работ; 4) працоўная сіла, занятая на вытворчасці, «важнай для нямецкіх ваенных інтарэсаў»; 5) працоўная сіла, якую выкарыстоўвалі ў вытворчасці прадукцыі для насельніцтва акупаваных тэрыторый [21, л. 9]. Працягласць працоўнага тыдня была не менш за 54 гадзіны. Калі з пачаткам аперацыі «Барбароса» ў заваявальных нямецкіх планах не прадугледжвалася татальнага выкарыстання працоўных рэсурсаў з

акупаваных савецкіх тэрыторый, у тым ліку з Беларусі, тады з улікам новых задач, якія сталі ў парадак дня зацяжной вайны на ўсходзе, «важным, вырашальным вытворчым фактарам з'яўляўся чалавек», без выкарыстання якога германскія ваенныя і грамадзянскія органы ўлады не маглі пачаць «працоўны працэс» на акупаванай тэрыторыі [22, S. 347].

Маштабы, геаграфія і формы выкарыстання беларускай працоўнай сілы становяцца відавочнымі ўжо ў 1942 г. Паміж аддзеламі працы грамадзянскай адміністрацыі, вярбовачнымі камісіямі, штабамі і іншымі германскімі ваенна-эканамічнымі і гаспадарчымі службамі пачалася сапраўдная вайна за працоўную сілу, попыт на якую пастаянна ўзрастаў не толькі ў эканоміцы германскага рэйха, так і на акупаванай усходняй тэрыторыі. Пры гэтым пастаўка рабочай сілы ў рэйх з'яўлялася больш прыярытэтнай задачай у параўнанні з яе выкарыстаннем на захопленай тэрыторыі. Калі ў першы год германскай акупацыі, з пункту гледжання нямецкіх уладаў, назіраўся лішак працоўнай сілы, тады як цягам 1942/43 гаспадарчага года станавіўся ўсё больш відавочным яе недахоп, асабліва профільных спецыялістаў. Асноўнымі прычынамі такога становішча з'яўляліся, па-першае, арганізаваны ў рамках праграм генеральнага ўпаўнаважанага па выкарыстанні працоўнай сілы мэтавы вываз мясцовага насельніцтва і ваеннапалонных на работы ў рэйх; па-другое, значнае змяншэнне колькасці працоўнай сілы ў выніку гібелі ваеннапалонных, ліквідацыі яўрэяў і скарачэння мясцовага насельніцтва; па-трэцяе, больш шырокае прыцягненне мясцовай сілы, асабліва працоўных рэсурсаў беларускага сяла, для работ па аднаўленні прамысловай вытворчасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі; і нарэшце, прыцягненне насельніцтва прыфрантавой зоны да пабудовы лініі палявых умацаванняў [23, S. 301].

Паводле статыстычных даных за 1942 г. агульная колькасць зарэгістраванай працоўнай сілы ў сельскай гаспадарцы генеральнай акругі «Беларусь» складала 1100 тыс. чалавек (30,6% ад агульнай колькасці працоўнай сілы ў РК «Остланд»), з якіх мужчыны складалі 385 тыс. ці 35,5%, жанчыны – 425 тыс. ці 38,6%, з іх на долю моладзі прыпадала 290 тыс. ці 26,4%. На канец года гэта лічба складала 45,8% ад агульнай колькасці ўсяго насельніцтва генеральнай акругі «Беларусь» [24, Bl. 17]. Вясной 1943 г. агульная колькасць працоўнай сілы ў акрузе зменшылася і складала 650 тыс. чалавек, з якіх 470 тыс. чалавек (ці 72 %) былі заняты ў сельскай гаспадарцы [25, S. 24].

На тэрыторыі эканамічнай інспекцыі «Цэнтр», размешчанай в Нова-Барысаве і вядучай сваю дзейнасць у тылавым раёне групы

армій «Цэнтр» (Mitte), агульная колькасць працоўнай сілы, якая выкарыстоўвалася ў сельскай гаспадарцы, складала 2 654 тыс. чалавек, з якіх 1 844 тыс. ці 69,5% складалі жанчыны і моладзь [26, Bl. 17]. Больш за палову гэтай колькасці працоўнай сілы знаходзілася на тэрыторыі Беларусі [27, Bl. 2]. Доля занятых у кантэксце агульнай колькасці насельніцтва на тэрыторыі ўсходняй Беларусі (вобласць тылу групы армій «Цэнтр») складала 41%, тады як у генеральнай акрузе «Беларусь» – 45,6 % [28, Bl. 304].

Дакументальныя матэрыялы паказваюць: з першых тыдняў рэалізацыі плана «Барбаросы» тэрыторыя Беларусі з ее пакінутым эканамічным патэнцыялам і людскімі рэсурсамі апынуліся галоўным аб'ектам эканамічнай эксплуатацыі для цэлага шэрагу германскіх акупацыйных ваенна-гаспадарчых органаў, у тым ліку: 3 гаспадарчых аддзелаў (IV Wi) пры галоўнакамундуючых (AOK) арміямі; 7 гаспадарчых групп (Gruppe IV Wi) пры палявых камендатурах, а таксама 4 гаспадарчых каманд (Wi Kdos) з трыма філіяламі пры гаспадарчай інспекцыі (Wi In) «Центр» [29, л. 81–87]. Да перадачы захопленай тэрыторыі на захад ад Барысава ў рукі грамадзянскай улады вайсковые часці запусцілі свой акупацыйны механізм па эксплуатацыі пакінутага пасля частковай эвакуацыі прамысловага і сельскагаспадарчага патэнцыялу БССР з яе людскімі рэсурсамі.

Тры гады германскай акупацыі, як вынікае з немецкіх дакументаў, пераўтварылі грамадзянскае насельніцтва разам з савецкімі ваеннапалоннымі, якія апынуліся ў тыле групы армій «Цэнтр», а таксама з мясцовымі і дэпартаванымі з краін Еўропы яўрэямі галоўным суб'ектам рабскай працы на месцах. Па стане на канец красавіка 1943 г. у гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» захаваліся наступныя статыстычныя звесткі: агульнае колькасць занятага насельніцтва, якое выкарыстоўвалася ў германскіх інтарэсах ў розных сферах прамысловай вытворчасці, лясной гаспадарцы, на абслугоўванні імперскай чыгункі, у будаўнічай арганізацыі «Тодта», былі заняты рамяством і працай у органах і службах мясцовай адміністрацыі, а таксама занятых на абслугоўванні германскага вермахта (без дапаможных падраздзяленняў вермахта), складала больш за 550 тысяч чалавек. З больш 1,5 млн. чалавек, занятых летам 1942 г. у сельскай гаспадарцы, 38% складалі мужчыны і 62% – жанчыны [9, с. 86; 13, с. 135; 14, с. 398]. Вынікае, што найбольш маштабным з'яўлялася працягененне жыхароў беларускай вёскі да выканання абавязковых харчовых паставак для германскага вермахта.

Трагедыя грамадзянскага насельніцтва, якое знаходзілася на акупаванай тэрыторыі Беларусі, доўгія гады заключалася таксама ў

тым, што ў імя захавання свайго далейшага жыцця і спрыяльнага забеспячэнне лёсу сваім родным, заняцця пэўнага палажэння ў савецкім грамадстве патрэбна было замоўчваць шматлікія факты ваеннага часу, асабліва германскай акупацыі, ў тым ліку факты гісторыі эканамічнага генацыду ў гады нацысцкай акупацыі Беларусі. Гэта катэгорыя грамадзян даволі часта застаецца непрыкмечанай і ў цяперашні час, фактычна выключаецца з нацыянальнага пантэону гістарычнай памяці. У тых жа сем'ях, якім пашчасціла прайсці праз гэтыя выпрабаванні і вынесці цяжар прымусовай працы на акупаванай тэрыторыі, і праз 76 гадоў пасля заканчэння вайны маўкліва зберагаюць памяць аб драматычных старонках ваеннай паўсядзённасці у Беларусі. Уключэнне гэтых імёнаў у агульны спіс ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, асабліва ў рамках усебеларускай акцыі «Беларусь памятае» [30], з'яўлялася б важным крокам па ўшанаванні памяці аб тых людзях у нацыянальнай хроніцы гістарычнай памяці і фарміраванню на якасна новым узроўні так неабходных элементаў сучаснай культуры памяці ў беларускім грамадстве XXI стагоддзя.

1. Белорусские остарбайтеры: историко-аналитическое исследование Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко, Н.А. Бондаренко, В.Д. Селеменев; под ред. Г.Д. Кнатько. – Минск: НАРБ, 2001. – 336 с.

2. Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944): Документы и материалы. В 2 кн. Кн. 1 (1941–1942) / Сост. Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко и др. – Минск: НАРБ, 1996. – 304 с.

3. Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944): Документы и материалы. В 2 кн. Кн. 2 (1943–1944) / Сост. Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко и др. – Минск: НАРБ, 1996. – 472 с.

4. Белорусские остарбайтеры. Репатриация (1944–1951): Документы и материалы. В 2 ч. Ч. 1 / Сост. Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко и др. – Минск: НАРБ, 1998. – 368 с.

5. Белорусские остарбайтеры. Репатриация (1944–1951): Документы и материалы. В 2 ч. Ч. 2 / Сост. Г.Д. Кнатько, В.И. Адамушко и др. – Минск: НАРБ, 1998. – 310 с.

6. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 / А. А. Коваленя (рук. авторского проекта), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко и др. – Минск: БЕЛТА, 2005. – 544 с.

7. Гребень, Е. А. Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941–1944 гг.): автореф. дис. ...канд. ист. наук: 07.00.02 / Е.А. Гребень; БГУ. – Минск, 2005. – 19 с.

8. Беларусь у перыяд Вялікай Айчыннай вайны: погляд у святле новых крыніц / Аўт.-уклад.: Г.А. Болсун, Я.А. Грэбень, Ю.У. Звераў, І.Ю. Сервачынскі / пад. рэд. С.Я. Новікава, У.І. Лемяшонка. – Мінск: Медысонт, 2005. – С. 61–104.

9. Літвін, А. М. Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг. / А. М. Літвін, Я. А. Грэбень, С. Я. Новікаў; агул. Рэд. А. М. Літвіна; пер. В. А. Лойка, С. П. Паўлавіцкі. – Мінск: Тэсей, 2010. – 584 с.

10. Dalhouski, A. „Menschenmaterial“: Arbeitseinsatz der belarussischen Zwangsarbeiter unter der nationalsozialistischen Herrschaft. Magisterarbeit / A. Dalhouski. – Aachen, 2008. – S. 41–42.

11. Herbert, U. Zwangsarbeit im 20. Jahrhundert. Begriffe, Entwicklung, Definitionen / U. Herbert // Zwangsarbeit in Hitlers Europas. Besatzung, Arbeit, Folgen. Hrsg. Von Dieter Pohl und Tanja Sebta. – Berlin: Metropol, 2013. – S. 31–33.

12. Novikau, S. Wirtschaftliche Ausbeutung und Zwangsarbeit in Weissrussland während der deutschen Besatzung von 1941–1944 / S. Novikau // Zwangsarbeit in Hitlers Europas. Besatzung, Arbeit, Folgen. Hrsg. Von Dieter Pohl und Tanja Sebta. – Berlin: Metropol, 2013. – S. 129–163.

13. Новікаў, С.Я. Колькасныя маштабы прыцягнення беларускага насельніцтва нямецкай ваеннай адміністрацыяй да прымусовай працы на тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.) / С. Я. Новікаў // Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.): зборнік навуковых артыкулаў / пад рэд. А. М. Літвіна. – Мінск: Медысонт, 2010. – С. 83–135.

14. Новиков, С. Е. Ужесточение нацистского оккупационного режима на территории Беларуси / С. Е. Новиков // Страна в огне: В 3 т. Т. 2. Коренной перелом. 1942–1943 : В 2 кн. Кн. 1. Очерки / Отв. Ред. Литвин А. М., Никифоров Ю. А. – М.: «Абрис», 2018. – С. 360–428.

15. Aus den Richtlinien des Wirtschaftsführungsstabes Ost (Grüne Mappe, Teil I) über die Zwangsarbeit der Bevölkerung in den besetzten sowjetischen Gebieten, Juni 1941 // Okkupation, Raub, Vernichtung: Dokumente zur Besatzungspolitik der faschistischen Wehrmacht auf sowjetischem Territorium 1941 bis 1944 / hrsg. Von Norbert Müller. – Berlin: Militärverlag, 1980. – S. 279–281.

16. Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 1999. – 1232 S.

17. Российский государственный военный архив (далее – РГВА). – Ф. 1358 К, оп. 4, д. 1: BfdVP, Wi Fü Stab Ost, V.P.19206/6 g v. 20.11.41 (Abschrift). – Л. 42–51.

18. Bundesarchiv-Militärarchiv (далее BA-MA). – RW 31/85: RM d GR. Beauftragter für den Vierteljahresplan. Wirtschaftsführungsstab Ost, V.P. 19203/6 g. – Bl. 74;

19. Aus der Richtlinien von Hinrich Lohse, Reichskommissar für das Ostland, vom 13. August 1941 für die Behandlung jüdischer Bürger // Die faschistische Okkupationspolitik in den zeitweilig besetzten Gebieten der Sowjetunion (1941–1944) / Dokumentenauswahl und Einleitung von Norbert Müller unter Mitarbeit von Uwe Löbel und Ulrich Freye. – Berlin: Deutscher Verlag der Wissenschaften, 1991. – S. 188.

20. Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларуси 1941–1944 / Авт.-сост. В.И. Адамушко и др.: науч. Ред. Р.П. Платонов, В.И. Адамушко. – Минск: НАРБ, 2001. – С. 7.

21. Национальный архив Республики Беларусь (далее – НА РБ). – Ф. 378. – Оп. 1. – Д. 189: Der Beauftragte für VJP; Der Generalbevollmächtigte für den

Arbeitseinsatz, Va 5550/611 v. 14.09.42: Anordnung Nr. 10 des GBA über den Einsatz von Arbeitskräften der besetzten Ostgebieten. – Л. 9.

22. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941–1943 / hrsg. Von Rolf-Dieter Müller. – Boppard a. Rh.: Harald Boldt Verlag, 1991. – S. 347.

23. Verordnung über Arbeitspflicht und Arbeitseinsatz im Operationsgebiet der neu besetzten Ostgebiete // Die deutsche Wirtschaftspolitik in dem besetzten sowjetischen Gebieten 1941–1943 / hrsg. Und eingeleitet von Rolf-Dieter Müller. – Boppard am Rhein, 1991. – S. 301.

24. BA-MA. – RW 31/306: Wi Stab Ost, Chefgr, La 2a 3 und RMfbO, III E 2a: Die Landwirtschaft in den besetzten Ostgebieten. Statistik der landwirtschaftlichen Erzeugung 1942. – Bl. 17.

25. Die wirtschaftliche Lage in Weißruthenien, in: Protokoll über die Tagung der Gebietskommissare, Hauptabteilungsleiter und Abteilungsleiter des Generalkommissars in Minsk vom 8. April bis 10 April 1943 // Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа «Белоруссия» (Минск, 8–10 апреля 1943 года) / Авторы-сост. С.В. Жумарь, С.Е. Новиков, Р.А. Черноглазова; пер. с нем. Г.Н. Белькевич, О.А. Лойко, С.Е. Новиков, С.П. Павловицкий. – Минск: МГЛУ, 2006. – S. 24.

26. BA-MA. – RW 31/306: Wi Stab Ost, Chefgr, La 2a 3 und RMfbO, III E 2a: Die Landwirtschaft in den besetzten Ostgebieten. Statistik der landwirtschaftlichen Erzeugung 1942. – Bl. 17.

27. BA-MA. – RW 31/558: Wi In Mitte, Chefgruppe Fü / Abt. Arbeit, Az.: 4200 v. 31.3.42: Lagebericht für Monat März 1942 (Anlage 1). – Bl. 2.

28. BA-MA. – RW 31/562: Wi In Mitte, Chefgruppe Arbeit: Grundlagen für Arbeitseinsatzplanung v. 31.12.42. – Bl. 304.

29. НА РБ. – Ф. 412. – Оп. 1. – Д. 21: Wi In Mitte. Besondere Anordnung Nr. 1 v. 12.7.41. – Л. 81–87 (подсчитано автором).

30. Рекомендации по проведению в учреждениях образования республиканской акции «Беларусь помнит» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.mininform.gov.by/meropriyatiya/belarus-pomnit/. – Дата доступу: 01.11.2020.

## NACIST ECONOMIC GENOCIDE IN BELARUS AS REFLECTED BY DOMESTIC AND FOREIGN SOURCES

***Siarhei Novikau***
*Minsk State Linquistic University, Minsk, Belarus, novikau@tut.by*

The article is devoted to the analysis of the research of the historical sources and the results of the research work of Belarusian and German historians of the economic genocide of the civilian population of Belarus 1941–1944. The author came to the conclusion that many categories of the people in the occupied territory of Belarus were changed from the objects of the Nazi economic policy to be the main sources of slave labor in the territory of Belarus. The most important and the largest from the standpoint of scale was the recruitment of the Belarusian residents of the villages in the fulfillment of the obligatory deliveries of foodstuffs to the German Wehrmacht.

***Keywords:* *Civilian population, documentary sources, historiographical facts, Nazi economic policy, economic genocide, slave labor.***